(1881), «Стары касцёл у Кабыльніку Свянцянскага павета 1880», фальклорная публікацыя «Усяночная арацыя» (1897).

*Літ.*: [Romer-Ochenkowska H.] Sztuka litewska: A.Römer // Litwa i Ruś. 1913. R. 2, z. 7—9; Aľtanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T 4. 2 wyd. Wrocław etc., 1993.

*Анатоль Літвіновіч.*

**РОМЕР** (Römer) Міхал Піус [25.4(7.5).1880, в. Багдонішкі Новааляксандраўскага пав. Ковенскай губ., цяпер Панявежскі пав. Літвы — 22.2.1945], польскі і літ. вучоны, грамадска-паліт. дзеяч; адзін з гал. ідэолагаў ліберальна-дэмакр. крыла *краёўцаў*. Вучыўся ў Ягелонскім ун-це ў Кракаве (1901—02), Парыжскай школе паліт. навук (1902—05). У 1911—15 супрацоўнічаў з бел. газ. «Наша ніва», чл. рэдакцыі віленскай газ. «Kurier Krajowy» («Краёвы кур'ер»; 1913). Узначальваў віленскую масонскую ложу «Літва», членамі якой былі А. *Луцкевіч* і В. *Ластоўскі*. Станоўча ацэньваў грамадска-паліт. і культ. адраджэнне беларусаў, абараняў бел. рух ад нападак польскіх і рус. шавіністычных колаў. У 1913—15 распрацаваў канцэпцыю новай Рэчы Паспалітай у выглядзе канфедэрацыі Польшчы і «гістарычнай Літвы» як самаст. і дэмакр. дзяржаў. Для вырашэння гэтай задачы ў 1915 далучыўся да легіёнаў Ю. Пілсудскага. У 1919 па даручэнні апошняга вёў у Коўне перагаворы з літ. кіраўніцтвам пра стварэнне канфедэрацыі, але літ. бок не прыняў гэтую прапанову. У 1920 асудзіў захоп Вільні войскамі ген. Л.*Жалігоўскага* і ў знак пратэсту пераехаў у Літву. Праф. права (1922) і рэктар Ковенскага (1927—28, 1933—39), праф. Віленскага (1940—45) ун-таў. У час ням.-фаш. акупацыі арганізоўваў у Вільні тайнае навучанне, падтрымліваў сувязь з рухам Супраціўлення.

*Тв.*: Litwa: Studyum o odrodzeniu narodu litewskiego. Lwow, 1908.

*Літ.*: Венцлова А. Буря в полдень. М., 1978. С. 406; Смалянчук А. Дзённік Міхала Ромера як крыніца па гісторыі Беларусі пачатку XX ст. // Бел. гіст. агляд. Мн., 1998. Т. 5, сш. 1 (8); Bardach J. O dawnej i niedawnej Litwie. Poznań, 1988; Ochmański J. Zapiski Michała Römera o Rewolucji Październikowej // Najnowsze dzieje Polski. Warszawa, 1967. T. 12. *Алесь Смалянчук.*

**РОП** (Ropp) Эдвард фон [2(14).12.1851, маёнтак Ліксна Дынабургскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія — 25.7.1939], рэлігійны і грамадска-палітычны дзеяч Літвы і Беларусі. Бацька паходзіў з прыбалтыйскага ням. баронскага роду, маці — з роду *Плятараў*. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1875), Ковенскую рымска-каталіцкую духоўную семінарыю (1886), удасканальваў тэалагічную адукацыю ў Інсбрукскім і Фрэйбургскім ун-тах. З 1889 ксёндз у Лібаве (цяпер Ліепая, Латвія), з 1896 канонік Жмудскай дыяцэзіі. З 1902 біскуп ціраспальскі, у 1904—07 — віленскі. Быў супраць атаясамлівання каталіцызму з польскасцю, спрыяў увядзенню літ. і бел. моў у царк. жыццё. Належаў да кансерватыўнага крыла *краёўцаў*. Ініцыятар і заснавальнік *Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі* (1906). У пач. 1906 заснаваў газ. «Nowine Wileńckie» («Віленскія навіны»), у 1906 — 09 валодаў *«Кур'ерам Літэўскім»*. Дэпутат I Дзярж. думы (1906), уваходзіў у «Кола тэрытарыяльнае» (аб'ядноўвала польскіх дэпутатаў ад Беларусі, Літвы і Украіны) і ў фракцыю аўтанамістаў. У кастр. 1907 загадам міністра ўнутр. спраў адхілены ад кіравання дыяцэзіяй, каля 10 гадоў жыў у маёнтку Нішча Віцебскай губ. пад наглядам паліцыі. У ліп. 1917 прызначаны арцыбіскупам *Магілёўскай рымска-каталіцкай архіепархіі* з рэзідэнцыяй у Петраградзе. У пач. 1919 загадаў духавенству правесці выбары ЦК сваёй архіепархіі, пасля чаго арыштаваны Петраградскай ЧК як заложнік. У выніку хадайніцтва папы рымскага і за дазвол праехаць у Расію з Германіі сав. парт. дзеячу К. Радэку вызвалены і адпраўлены ў Польшчу. Там працягваў рэліг. і грамадскую дзейнасць. Да 1931 фармальна лічыўся арцыбіскупам магілёўскім.



Э.Роп.

*Тв.*: Program Stronnictwa Konstytucyjno-Katolickiego na Litwie i Białorusi. Wilno, 1906.

*Літ.*: Ленин В.И. Телеграмма Г.Е. Зиновьеву // Полн. собр. соч. Т. 50. С. 252; Смалянчук А. Біскуп Эдвард Роп // Бел. гіст. часоп. 1994. № 3; Stankiewicz A. Rodnaja mowa u swiatyniach. Wilnia, 1929 (факс. выд. 1992). *Алесь Смалянчук.*

**«РО́СКВІТ»**, літаратурна-мастацкі часопіс, орган «Беларускай літаратурна-мастацкай камуны» (1927—28). Выдаваўся са снеж. 1927 да крас. 1928 у Мінску на бел. мове. Рэдактар П. Шукайла. Арыентаваўся на маскоўскі Левы фронт мастацтва (ЛЕФ, 1922 — 28), футурызм, творчасць У. Маякоўскага. Пад уплывам камуністычнай ідэалогіі і эстэтыкі канструктывізму літаратары «Р.» абсалютызавалі функцыянальна-паліт. і вытворча-прапагандысцкія аспекты мастацтва, адмаўлялі каштоўнасць эмацыянальнага зместу, лірычнасці і ўмоўнасці паэтычных вобразаў, практыкавалі тэлеграфна-інфарматыўны і кінематаграфічна-мантажны стыль у паэзіі, прозе і публіцыстыцы. Часопіс друкаваў раннія вершы П. Броўкі, вершы і прозу Я. Скрыгана (пад псеўд. Відук), Шукайлы, А. Кананавіча (пад псеўд. А. Атава), У. Прыбыткоўскага, Ю. Лявоннага, аповесць А. Гародні «Варта на Рэйне». У нарысе Шукайлы «Літаратурнае сёння», інш. палемічных артыкулах дапускаліся грубыя выпады супраць лірычнай паэзіі С. Ясеніна, У. Жылкі, П. Труса, Я. Пушчы, С. Дарожнага, А. Вольнага, Т. Кляшторнага. Выйшлі 2 нумары.

*Уладзімір Конан.*

**РО́СМАН** Іосіф Самуілавіч (9.9.1913, в. Стараселле Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н — 17.12.1992), бел. гісторык. Доктар гіст. н. (1976), праф. (1977). Засл. работнік вышэйшай школы БССР (1975). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1934), Вышэйшую парт. школу пры ЦК ВКП(б) (1941). З 1934 выкладчык рабфака пры БДУ у г. Бабруйск, дырэктар сярэдняй школы, Полацкага педвучылішча, з 1938 інструктар аддзела школ і навукі ЦК ВКП(б)Б, лектар ЦК КП(б)Б. У 1941—44 у Сяміпалацінскіх гаркоме і абкоме Кампартыі Казахстана. У 1944 — 47 пам. 2-га сакратара ЦК КП(б)Б, з 1947 ва Упраўленні прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б. З вер. 1950 ст. выкладчык Рэсп. парт. школы пры ЦК КП(б)Б, з 1955 дацэнт, у 1977 — праф. кафедры гісторыі КПСС Мінскай ВПШ. Даследаваў гісторыю Камуніст. партыі Беларусі 1930—80-х г. Адзін з аўтараў «Нарысаў гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі» (ч. 2. 1967), «Курса лекцый па гісторыі КПСС» (ч. 2, 1971, 2-е выд. 1974).

*Тв.*: КПСС в период развернутого строительства коммунизма Мн., 1963 (у сааўт.); Сіла партыі — у яе непарыўнай сувязі з масамі. Мн., 1967; Компартня Белоруссии в борьбе за упрочение социалистического общества в предвоенные годы (1938—июнь 1941 гг.). Мн., 1975. *Эмануіл Іофе*

**РОСЬ**, гарадскі пасёлак у Ваўкавыскім р-не, цэнтр пасялковага Савета, на р. Рось, чыг. ст. на лініі Ваўкавыск — Масты. За 17 км ад Ваўкавыска. 7,3 тыс. ж. (1999).

У ВКЛ вядома з 16 ст. як мястэчка Ваўкавыскага пав. Навагрудскага ваяв. Побач знаходзіўся маёнтак Хадкевічаў, таму другая назва Р. — Падросль. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у Слонімскай, Літоўскай, з 1801 у Гродзенскай губ., цэнтр Роскай воласці Ваўкавыскага пав. У вайну 1812 дзейнічаў партыз. атрад. У канцы 19 ст. больш за 700 ж., школа, 4 крамы, 2 шавецкія майстэрні, шкіпінарны з-д, вадзяны млын, ваўначоска. З пабудовай у 1886 Баранавіцка-Беластоцкай чыгункі Р. — чыг. станцыя. У 1915 — акупіравана германскімі войскамі. У 1921—39 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Ваўкавыскага пав. Беластоцкага ваяв. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 вёска Ваўкавыскага р-на Беластоцкай вобл. З чэрв. 1941 да 14.7.1944 акупіравана ням. фашыстамі, якія загубілі тут 45 жыхароў. З